*УДК 372.881.1*

# РАЗВІЦЦЁ ПАЗНАВАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦІ ВУЧНЯЎ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ЭФЕКТЫЎНЫХ АРФАГРАФІЧНЫХ ЗАДАННЯЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»

**І. М. Дзядкоўская**

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа №13 г. Мазыра», б-р Юнацтва, 47, 247760, г. Мазыр, Беларусь, irinaded4883@gmail.com*

У артыкуле прааналізавана эфектыўнасць выкарыстання заданняў па арфаграфіі ў працэсе навучання беларускай мове. Арфаграфія мае выключнае значэнне ў школьным навучанні, паколькі валоданне арфаграфічнымі нормамі, выпрацоўка ўменняў правільна пісаць неабходна кожнаму вучню, кім бы ён ні стаў у будучым. Вось чаму, зыходзячы найперш з грамадскай, сацыяльнай ролі арфаграфічных нормаў, настаўнік павінен даводзіць вучням неабходнасць авалодвання імі, бо рознага тыпу няправільныя напісанні перашкаджаюць моўным зносінам людзей. Пры выкладанні арфаграфіі кіруюся прынцыпалі сістэматычнасці, паслядоўнасці, сувязі тэорыі з практыкай, нагляднасці, пераемнасці і перспектыўнасці, індывідуальнага падыходу да вучняў, навуковасці.

***Ключавыя словы:*** беларуская мова; арфаграфія; арфаграфічныя заданні; пазнавальная актыўнасць; арфаграфічныя ўменні і навыкі.

# DEVELOPMENT OF STUDENTS 'COGNITIVE ACTIVITY THROUGH THE USE OF EFFECTIVE SPELLING TASKS WHILE STUDYING THE SUBJECT «BELARUSIAN LANGUAGE»

**I. M. Dzyadkoskaya**

*State Educational Institution «Syardnyaya school No. 13 in Mazyr», Yunatstva blvd., 47, 247760, Mazyr, Belarus, irinaded4883@gmail.com*

The article analyzes the effectiveness of the use of spelling tasks in the process of learning the belarusian language. Spelling is extremely important in school, because the possession of spelling rules, the development of skills to write correctly is necessary for every student, whoever he becomes in the future. That is why, based primarily on the social role of spelling rules, the teacher must prove to students the need to master them, because different types of misspellings interfere with people's language communication. When teaching spelling, I am guided by the principles of systematicity, consistency, connection of theory with practice, clarity, continuity and perspective, individual approach to students, scientific.

***Key words:*** belarusian language; spelling; spelling tasks; cognitive activity; spelling skills.

У адукацыйным стандарце базавай адукацыі па вучэбнаму прадмету «Беларуская мова» падкрэсліваецца, што працэс навучання павінен быць накіраваны на развіццё здольнасцей і інтарэсаў вучняў, арганізацыю работы па выпрацоўцы практычных уменняў і навыкаў, спосабаў дзейнасці, развіццё і ўдасканаленне вуснага і пісьмовага маўлення. Неабходна так наладжваць адукацыйны працэс, каб вучні асэнсоўвалі кожную моўную адзінку, арыентуючыся на асаблівасці яе ўжывання ў маўленні, сістэматычна і паслядоўна фарміравалі і развівалі арфаграфічныя навыкі [1]. Недахопы ў арфаграфічнай пісьменнасці сведчаць пра недастатковае развіццё маўлення вучняў, неразуменне значэнняў слоў, іх частак, сэнсавых і граматычных адносін паміж словамі. Менавіта таму ў сваёй практыцы вялікую ўвагу надаю развіццю пазнавальнай актыўнасці вучняў як сродку фарміравання і развіцця арфаграфічнай пісьменнасці.

Прааналізаваўшы вынікі дыягностыкі ўзроўню пазнавальнай актыўнасці і пазнавальнай патрэбнасці вучняў 5 класа (методыкі: «Дыягностыка ўзроўню пазнавальнай актыўнасці вучняў» (Г. І. Шчукіна, Т. І. Шамава); «Дыягностыка пазнавальнай патрэбнасці» (В. С. Юркевіч), прыйшла да высновы, што ўсяго 16 % вучняў маюць высокі ўзровень пазнавальнай актыўнасці. Толькі 24 % вучняў могуць самастойна знайсці адказ на пастаўленае пытанне, 32 % эмацыянальна адносяцца да цікавых для іх заданняў. Вынікі кантрольнага дыктанта, праведзенага ў 5 класе, паказалі, што толькі 24 % вучняў напісалі яго на высокім і дастатковым узроўнях, 52 % – на здавальняючым і нізкім узроўнях. Праблему развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў Т. І. Шамава разглядае «і як мэту дзейнасці, і як сродак яе дасягнення, і як вынік» [2, с. 86]. На думку Г. І. Шчукінай, фарміраванню пазнавальнай актыўнасці спрыяюць змест навучання, працэс пазнавальнай дзейнасці вучняў і адносіны, якія складваюцца ў адукацыйным працэсе паміж яго ўдзельнікамі [3, с. 27]. Такім чынам, развіццё пазнавальнай актыўнасці на ўроках беларускай мовы з’яўляецца сродкам удасканалення арфаграфічных уменняў і навыкаў, развіцця лагічнага мыслення, паказчыкам інтэлектуальнай, моўнай і духоўнай культуры вучня.

Вопыт паказвае, што арфаграфічная пісьменнасць вучняў адчувальна ўзрастае, калі яны ўсвядомілі найважнейшыя тэарэтычныя палажэнні беларускай арфаграфіі; маюць дакладнае ўяўленне аб арфаграме; засвоілі асноўныя прынцыпы правапісу; зразумелі існуючыя суадносіны паміж вымаўленнем і напісаннем. Работу над арфаграфічным правілам будую па схеме: стварэнне праблемнай сітуацыі і мэтавая ўстаноўка з матыва-

цыяй неабходнасці ведання гэтай арфаграмы; выснова вучня, знаёмства з высновай падручніка; перавод тэарэтычных ведаў ва ўменне карыстацца гэтымі ведамі (складанне алгарытму разважання); адпрацоўка ўзору разважання на аснове выканання практыкаванняў; дыягнастычная і карэкцыйная работа. На кожным уроку праводжу арфаграфічныя хвілінкі, якія дазваляюць выявіць узровень засваення вучэбнага матэрыялу, актывізуюць увагу вучняў і ствараюць аснову для развіцця арфаграфічнай пісьменнасці.

У 5 класе на вучэбных занятках арганізую калектыўную дзейнасць. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы «Вымаўленне і правапіс галосных *о, э, а*» на этапе праверкі дамашняга задання праводжу слоўнікавую работу. Вучні прагаворваюць гукі, тлумачаць напісанне слоў і запісваюць словы: *г..рбарый, с..кунда, з..фір, п..рсцёнак, л..сны, верац..но, л..снічоўка, по..с, пам..ць*. На этапе праверкі разумення вучнямі новага вучэбнага матэрыялу прапаную выбарачны дыктант: выпісаць толькі словы з літарамі *о, э* і графічна вызначыць арфаграмы. На этапе замацавання новага вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваю заданне: змяніць словы або падабраць аднакаранёвыя так, каб галосныя *о, э* сталі не пад націскам (*клопат, звон, шэрсць, дождж, колер, шэпт, чорны, полымя, сэрца, розум, шоўк*). Выкарыстоўваю прыём «Карэктар». На этапе падвядзення вынікаў урока вучні выконваюць тэставую работу «Правапіс слоў з літарамі *о, э – а*».

У 6 класе для павышэння арфаграфічнай граматнасці вучняў выкарыстоўваю індывідуальныя заданні-карткі па ўсіх тэмах арфаграфіі, рознаўзроўневыя арфаграфічныя заданні, тэставыя заданні, творчыя заданні, комплексную работу з тэкстам, складанне словазлучэнняў і сказаў, пераклад слоў, словазлучэнняў, тэкстаў. Пры вывучэнні тэмы «Правапіс *-н-, -нн-* у прыметніках» на этапе праверкі дамашняга задання паўтараем тэму «Правапіс *у* і *ў*» (табл. 1).

*Табліца 1*

**Бліц-тэст «Правапіс *у* і *ў*»**

| А1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *ў*: | А2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *у*: |
|---|---|
| 1) та..сценны; | 1) мо..ны; |
| 2) ва ..ніверсітэце; | 2) пайшоў .. кіно; |
| 3) гучнае «..ра»; | 3) ра..нінны; |
| 4) гармонік ..зяў у рукі; | 4) накры..ка; |
| 5) дра..ляны. | 5) каля ..рны. |

На этапе падрыхтоўкі да актыўнага засваення вучэбнага матэрыялу для павышэння матывацыі вучняў арганізую работу па паўтарэнні вядо-

мых тэрмінаў (суфіксальны спосаб утварэння прыметнікаў, утваральная аснова, словаўтваральныя суфіксы, формаўтваральныя суфіксы, суфіксы са значэннем ацэнкі) і прапаную ў папярэднім заданні (бліц-тэст) вызначыць прыметнікі, паспрабаваць растлумачыць іх правапіс (праблемнае пытанне) і вызначыць тэму ўрока. На этапе замацавання ведаў і спосабаў дзейнасці вучні выконваюць практыкаванне (запісаць словы, зрабіць выснову пра напісанне *-н-, -нн-* у залежнасці ад утваральнай асновы: *калядны, вячэрні, зорны, санны, песенны, шкляны, дзённы, цагляны, шырачэнны, даўжэнны, палымяны, вогненны, іменны*); пішуць выбарачны дыктант і тлумачаць правапіс *-н-, -нн-* у прыметніках; самастойна выконваюць рознаўзроўневыя заданні. Пасля праверкі рознаўзроўневых заданняў і карэкцыйнай работы вучні выконваюць інтэрактыўнае заданне «Правапіс *-н-, -нн-* у прыметніках». На этапе інфарміравання аб дамашнім заданні прапаную скласці размеркавальны дыктант па тэме ўрока або напісаць сачыненне «Зімовы дзень», выкарыстоўваючы прыметнікі з *-н-, -нн-*; падрыхтаваць вучэбнае паведамленне «Правапіс *-н-, -нн-* у прыметніках».

Перад тлумачэннем тэмы «Правапіс *не (ня)* з прыметнікамі» ў 6 класе на этапе актуалізацыі ведаў і спосабаў дзейнасці праводжу арфаграфічную хвілінку, у якую ўключаю словы на правапіс *не (ня)* з назоўнікамі, дзеясловамі, прыметнікамі. Гэта дапамагае на матывацыйным этапе ўрока сфарміраваць арыенціровачную аснову дзейнасці вучняў да плануемай тэмы ўрока і стварыць праблемную сітуацыю.

У 7 класе пры вывучэнні тэмы «Правапіс прыслоўяў праз дэфіс» на этапе праверкі дамашняга задання паўтараем тэарэтычны матэрыял па тэме «Правапіс падоўжаных зычных» (прыём «Тэма ў пытаннях»); прапаную выканаць заданне «Падбяры сваякоў» (падабраць і запісаць па тры прыклады да слоў *насенне, Ульяна, група*). На этапе тлумачэння новага матэрыялу арганізую калектыўную работу з тэарэтычным матэрыялам і прапаную растлумачыць правапіс прыслоўяў, якія вызначылі ў вышэйназваным тэксце. На этапе замацавання ведаў і спосабаў дзейнасці вучні выконваюць вуснае заданне: растлумачыць правапіс прыслоўяў *абы-як, куды-небудзь, далёка-далёка, раз-пораз, крыж-накрыж, сюды-туды, па-новаму, па-сяброўску, па-сабачы, па-другое, па-бацькоўску*; пішуць выбарачны дыктант і правяраюць па кюар коду; звяртаюцца да тэарэтычнага матэрыялу з мэтай карэкцыі ведаў. Выкарыстоўваю прыём «Ліст з белымі плямамі» (дапісаць па тры прыслоўі да кожнага рада: а) *марозны*; б) *бетонны*; в) *вераб'іны*). Прапаную выканаць тэставыя заданні, размешчаныя на адзіным інфармацыйна-адукацыйным рэсурсе, заданні па варыянтах, індывідуальныя заданні па картках (табл. 2).

*Табліца 2*

**Індывідуальныя заданні па картках**

| Варыянт 1 | Варыянт 2 |
|---|---|
| ***Заданне: выпісаць толькі прыслоўі, якія пішуцца праз дэфіс*** | |
| Ледзь ледзь, дзе нідзе, па ранейшаму, па жнівеньску, не як, што дзень, за летась, на памяць, раз пораз, у трох, сям там, як небудзь, які сьці, ціха ціха, па першае, у першыню, калі нікалі, па роўну, не дзе. | Па святочнаму, што год, па майстэрску, па абапал, перш наперш, абы дзе, па веснавому, след у след, па ціху, па троху, раз у раз, мала па малу, пакуль што, абы дзе, па воўчы, тэт а тэт, па мойму, ні як. |

На этапе інфарміравання аб дамашнім заданні прапаную запісаць сказы, раскрываючы дужкі, і графічна растлумачыць правапіс прыслоўяў; скласці слоўнікавы дыктант або выканаць тэставыя заданні па тэме «Правапіс прыслоўяў праз дэфіс».

Пабудаваная такім чынам работа садзейнічае ўсвядомленаму і канкрэтнаму ўспрыманню вучэбнага матэрыялу, павышэнню арфаграфічнай граматнасці вучняў і пераходу да сістэматычнай самастойнай работы ў 8–9 класах.

У 8 класе выкарыстоўваю тэставыя заданні, комплексную работу з тэкстам, складанне сказаў, пераклад сказаў і тэкстаў, вусны адказ на тэарэтычнае пытанне з выкарыстаннем апорных схем, слоўнікавыя дыктанты. Пры вывучэнні тэмы «Сказы з аднароднымі членамі» на этапе праверкі дамашняга задання паўтараем тэму «Правапіс мяккага знака і апострафа» шляхам выканання інтэрактыўнага тэставага задання, размешчанага на адзіным інфармацыйна-адукацыйным рэсурсе. На этапе тлумачэння новага матэрыялу праводжу гутарку па праблемных пытаннях: Як спалучаюцца паміж сабой аднародныя члены ў сказах? Якія словы не з’яўляюцца аднароднымі членамі сказа? Арганізую калектыўную работу з тэарэтычным матэрыялам падручніка, зачытваем сказы, запісаныя на дошцы, і тлумачым умовы пастаноўкі знакаў прыпынку пры аднародных членах. Каб усе вучні маглі хутка сарыентавацца ў новай тэме і авалодаць моўнымі тэрмінамі, выкарыстоўваю прыём «Ключавыя словы і выразы» (запісаны на дошцы). На этапе замацавання ведаў і спосабаў дзейнасці вучні выконваюць практыкаванне з падручніка: запісаць сказы, вызначыць аднародныя члены, растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку; графічна растлумачыць правапіс выдзеленых слоў. Прапаную выканаць тэставыя заданні, размешчаныя на адзіным інфармацыйна-адукацыйным рэсурсе, растлумачыць умовы пастаноўкі знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа; рознаўзроўневыя заданні. Выкарыстоўваю прыём «Карэктар»: вы-

правіць пунктуацыйныя памылкі ў схемах да сказаў з аднароднымі членамі. Праверка выканання ўсіх практыкаванняў абавязкова суправаджаецца арфаграфічным аналізам, тлумачэннем умоў пастаноўкі знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа.

Паслядоўна праведзеная работа па павышэнні арфаграфічнай пісьменнасці садзейнічае развіццю трывалых навыкаў літаратурнага вымаўлення і правапісу, выпрацоўцы спосабаў навучальнай дзейнасці і падрыхтоўцы вучняў да самастойнага стварэння сістэмы заданняў па арфаграфіі і пабудове лагічных ланцужкоў разважанняў у 9 класе.

Самастойная дзейнасць па складанні арфаграфічных заданняў (слоўнікавыя, выбарачныя, размеркавальныя, лічбавыя дыктанты; тэставыя заданні; пераклад словазлучэнняў, сказаў з рускай мовы на беларускую; індывідуальныя карткі) садзейнічае развіццю арфаграфічнай пісьменнасці, ацэначных уменняў і навыкаў вучняў. Навучанне арфаграфіі нельга ўявіць без неабходнасці выпрацоўкі ў вучняў свядомых суадносін паміж вымаўленнем і напісаннем. Вучні аналізуюць фанетычны склад слова, называюць арфаграмы, якія падпарадкоўваюцца фанетычнаму, марфалагічнаму прынцыпам правапісу. Пры марфемным і словаўтваральным разборах слоў тлумачаць асаблівасці іх напісання, абумоўленыя марфемнай будовай (напрыклад, пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны, перад літарамі *е, ё, ю, я, і* пішацца апостраф: *без'языкі, пад'еўшы, аб'ява*); словаўтварэннем (пішуцца праз злучок словы, утвораныя шляхам паўтору: *ціха-ціха, раз-пораз*). Выкарыстаныя метады і прыёмы садзейнічаюць выпрацоўцы практычных уменняў і навыкаў, развіццю камунікатыўнай культуры вучняў, што дапамагае ім граматычна правільна ствараць і афармляць вусныя і пісьмовыя паведамленні.

У 9 класе праведзена дыягностыка ўзроўню пазнавальнай актыўнасці і пазнавальнай патрэбнасці, якая паказала, што 88 % вучняў маюць высокі і сярэдні ўзроўні пазнавальнай актыўнасці. 76 % вучняў могуць самастойна знайсці адказ на пастаўленае пытанне, 80 % эмацыянальна адносяцца да цікавага для іх занятку, 76 % вучняў задаюць пытанні пры вывучэнні вучэбнага матэрыялу. Вынікі кантрольнага дыктанта, праведзенага ў 9 класе, паказалі, што 72 % вучняў напісалі яго на высокім і дастатковым узроўнях.

Сістэматычнае выкарыстанне заданняў па арфаграфіі садзейнічае аптымізацыі працэсу навучання за кошт змены відаў дзейнасці, актыўнаму ўдзелу вучняў у пазнаваўчым працэсе, скіроўвае іх да твор-

часці, дазваляе вызначыць індывідуальны адукацыйны маршрут з улікам здольнасцей і інтарэсаў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Адукацыйны стандарт базавай адукацыі [Электронны рэсурс] // Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь. URL: http://multilang.pravo.by/ru/Term/Index/4555?langName=ru&page=1&type=3 (дата звароту: 05.01.2023).

2. *Шамава Т. І.* Актывізацыя навучання школьнікаў. М. : Педагогіка, 1990.

3. *Шчукіна Г. І.* Педагагічныя праблемы фарміравання пазнавальных інтарэсаў вучняў. М. : Педагогіка, 2008.